# СУСТРЭЧА НА ПЕРСПЕКТЫВУ

На пачатку чэрвеня Віцебск наведаў Часовы Паверараны ў справах Каралеўства Нідэрландаў у Рэспубліцы Беларусь Паул ван Аоствейн, які сустрэўся з кіраўніцтвам горада і вобласці і пазнаёміўся з працай інвестараў у свабоднай эканамічнай зоне «Віцебск». Вынікам сустрэчы з першым намеснікам старшыні аблвыканкама Г.І. Грабнёвым стала дамоўленасць пра больш цеснае супрацоўніцтва, у прыватнасці ў сферы аграпрамысловага комплексу.

Акрамя таго, у рамках афіцыйнага візіту ў Віцебскую вобласць Паул ван Аоствейн наведаў наш універсітэт. Нідэрландскі дыпламат сустрэўся з рэктарам А.У. Ягоравым і абмеркаваў перспектывы супрацоўніцтва ВДУ імя П.М. Машэрава з навучальнымі ўстановамі Каралеўства Нідэрландаў, развіццё акадэмічнай мабільнасці, удзел у сумесных навукова-даследчых праектах.

Затым Часовага Паверанага ў справах Каралеўства Нідэрландаў у Рэспубліцы Беларусь чакала сустрэча са студэнтамі, магістрантамі і маладымі вучонымі нашай альма-матар. Дыпламат распавёў пра еўрапейскія тэндэнцыі ў сферы адукацыі, абмеркаваў з моладдзю розныя аспекты развіцця двухбаковых адносін паміж нашымі дзяржавамі і адказаў на шматлікія пытанні.

**УЛАСНАЯ ІНФАРМАЦЫЯ.**